(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

УДК 94(476-15)“1921/1939”(043.3)+332.2.021(476-15)(091)“1921/1939”(043.3)

**ГАРМАТНЫ**
**ВІТАЛЬ ПЯТРОВІЧ**

# ПРАВЯДЗЕННЕ КАМАСАЦЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

па спецыяльнасці 07.00.02 – Айчынная гісторыя

**МІНСК**
**2016**

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Навуковы кіраўнік – **Зялінскі Пётр Іосіфавіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Афіцыйныя апаненты: **Тугай Уладзімір Васільевіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык Цэнтра ўсеагульнай гісторыі і міжнародных адносін ДНУ “Інстытут гісторыі НАН Беларусі”;
**Цітовіч Ігар Уладзіміравіч**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, прарэктар па навукова-метадычнай рабоце ДУА “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”.

Апаніруючая арганізацыя – **УА “Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы”**.

Абарона адбудзецца 27 кастрычніка 2016 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02. 01. 05 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. Ленінградская, 8 (корпус юрыдычнага факультэта), ауд. 407.

Тэлефон вучонага сакратара: 209-57-09.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы “ ” верасня 2016 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
доктар гістарычных навук дацэнт А. А. Гужалоўскі

# УВОДЗІНЫ

На працягу большага перыяду айчыннай гісторыі асноўную частку беларускага насельніцтва складала сялянства, якое адыгрывала вырашальную ролю ў эканоміцы рэгіёна, з'яўлялася асноўным вытворцам матэрыяльнага багацця і захавальнікам нацыянальнай культуры. Не стала выключэннем і XX стагоддзе. Аднак далёка не ўсе моманты аграрнай гісторыі Беларусі вывучаны ў поўнай меры, перш за ўсё пытанне правядзення аграрных пераўтварэнняў у Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., таму неабходна выправіць гэтую сітуацыю.

Паводле падпісанага 18 сакавіка 1921 г. Рыжскага мірнага дагавора заходнебеларускія землі (былая Гродзенская губерня, Навагрудскі, Пінскі, часткова Мазырскі, Мінскі і Слуцкі ўезды Мінскай губерні, Дзісненскі, Лідскі і Ашмянскі ўезды Віленскай губерні) ўвайшлі ў склад міжваеннай польскай дзяржавы. Яшчэ ў кастрычніку 1920 г. пад юрысдыкцыю Польшчы трапіла "Сярэдняя Літва" – Вільня, Віленскі, Свянцянскі, часткова Трокскі ўезды. На згаданай тэрыторыі, населенай пераважна беларусамі, а таксама палякамі і літоўцамі, былі створаны чатыры ваяводствы, за якімі замацавалася неафіцыйная назва "Заходняя Беларусь".

**Геаграфічныя межы** даследавання былі выбраны з улікам асноўнай праблематыкі дысертацыі. Пад тэрмінам "Заходняя Беларусь" у дысертацыі разглядаюцца беларускія землі агульнай плошчай каля 82 000 км$^2$, якія ў 1921–1939 гг. знаходзіліся ў складзе Польскай Рэспублікі – гэта сучасныя Брэсцкая і Гродзенская поўнасцю і часткова Мінская і Віцебская вобласці (у азначаны перыяд – Навагрудскае ваяводства, Палескае ваяводства без Камень–Кашырскага, Сарненскага і часткі Пінскага і Столінскага паветаў, Гродзенскі, Ваўкавыскі і часткова Аўгустоўскі і Сакулкаўскі паветы Беластоцкага ваяводства, Ашмянскі, Браслаўскі, Вілейскі, Дзісненскі, Маладзечанскі, Пастаўскі і часткова Свянцянскі паветы Віленскага ваяводства), што ў цэлым складала прыблізна 24 % тэрыторыі і 11 % насельніцтва польскай дзяржавы[1]. Неабходна падкрэсліць, што ў тагачаснай польскай статыстыцы падлік вёўся ў асноўным па ваяводствах і Заходняя Беларусь не выдзялялася як асобны рэгіён. У адпаведнасці з прынятымі айчыннай гістарыяграфіяй правіламі за даныя па Заходняй Беларусі прымаюцца звесткі па Віленскім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах, лічачы ўмоўна, што Камень–Кашырскі і Віленска–Трокскі паветы па сваіх галоўных паказчыках прыкладна адпавядаюць Ваўкавыскаму і Гродзенскаму[2].

---

[1] Сорокин, А. А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии. 1920–1939 гг. / А. А. Сорокин. – Минск : [Наука и техника], 1968. – 201 с. [С. 11–13].

[2] Мілеўскі, Я. Е. Заходняя Беларусь: да пытання гісторыі і насельніцтва / Я. Е. Мілеўскі // Беларус. гіст. часоп. – 1998. – № 3. [С. 40]; Міхнюк, У. Заходняя Беларусь: да пытання тэрыторыі і насельніцтва (гістарыяграфічныя нататкі) / У. Міхнюк, А. Савіч // Беларус. гіст. часоп. – 2004. – № 11. [С. 15].

Вывучэнне аграрнай гісторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. з’яўляецца адной з актуальных задач, якія стаяць перад сучаснай беларускай гістарычнай навукай. Неабходна падкрэсліць, што ў разглядаемы перыяд сяляне складалі абсалютную большасць заходнебеларускага насельніцтва і адыгрывалі вырашальную ролю ў эканамічным жыцці рэгіёна, аднак знаходзіліся на самым нізе тагачаснай сацыяльнай лесвіцы.

У сельскай гаспадарцы Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. захоўвалася істотная колькасць перажыткаў, якія замаруджвалі яе далейшае развіццё. Галоўнымі з іх былі буйное памешчыцкае землеўладанне і цераспалосіца (наяўнасць у значнай часткі сялянства па некалькі раскіданых зямельных надзелаў). Зямля разглядалася ў гэты час як найбольш выгаднае капіталаўкладанне, таму свабодныя грошы сяляне трацілі пераважна на яе набыццё, што станавілася адной з прычын пашырэння цераспалосіцы. Зямельныя надзелы пераходзілі па спадчыне ад бацькі да сыноў і складалі яе асноўную і найбольш пажаданую частку. Улічваючы штогадавы вялікі натуральны прырост вясковага насельніцтва, гэта прыводзіла да хуткага драбнення і аддаленасці сялянскіх надзелаў.

На пачатку 1920–х гг. ва ўмовах пасляваеннай разрухі і галечы надзвычай цяжкае становішча сялян магло выліцца ў рэзкае незадавальненне палітыкай польскай дзяржавы. На той час у многіх краінах Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы ў барацьбе за свае правы і паляпшэнне матэрыяльнага становішча назіраліся шматлікія выступленні сялян і рабочых, якіх актыўна падтрымлівалі левыя партыі і ў першую чаргу камуністы. У такіх абставінах неабходна было тэрмінова вырашаць аграрнае пытанне. Адным з шляхоў гэтага стала камасацыя, спалучаная з парцэляцыяй (частковым падзелам за выкуп памешчыцкіх зямель), але свабодныя землі польскі ўрад у першую чаргу перадаваў асаднікам для замацавання свайго панавання на новадалучаных тэрыторыях.

Аналіз айчыннай і замежнай гістарыяграфіі дазваляе зрабіць выснову, што правядзенне камасацыі на землях Заходняй Беларусі вывучана даволі фрагментарна і многія важныя яе аспекты засталіся па-за ўвагай даследчыкаў. **Храналагічныя рамкі** дысертацыі ахопліваюць 1921–1939 гг. Ніжэйшай мяжой азначанага перыяду з’яўляецца заключэнне Рыжскага мірнага дагавора (18 сакавіка 1921 г.), паводле якога Заходняя Беларусь увайшла ў склад польскай дзяржавы, вышэйшай – 1 верасня 1939 г., пачатак Другой сусветнай вайны, у выніку чаго рэалізацыя камасацыі была перарвана. Дзеля больш поўнага і глыбокага раскрыцця асобных важных тэматычных пытанняў даследавання (галоўным чынам перадумоў камасацыі і асаблівасцей яе правядзення) аўтар дапускаў выхад за пазначаныя храналагічныя рамкі.

Актуальнасць дысертацыйнага даследавання абумоўлена адсутнасцю ў беларускай гістарыяграфіі асобнай працы па пытанні ажыццяўлення польскімі ўладамі камасацыі на землях Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Неабходна падкрэсліць, што ў многіх даследаваннях прадстаўнікоў польскай гістарыяграфіі камасацыя ўжываецца як сінонім тэрміна "ссяленне" (scalanie, з польскага "аб'яднанне зямель")[3]. У цэлым у гістарычнай навуцы існуе даволі шмат падыходаў да вызначэння сутнасці палітыкі камасацыі, таму аўтар дысертацыі прытрымліваецца наступнага асабістага тлумачэння: "камасацыя – гэта працэс аб'яднання раскіданых сялянскіх надзелаў з улікам іх грашовай вартасці, перанясення па магчымасці на новае месца хат і гаспадарчых пабудоў і стварэння такім чынам значнай колькасці хутароў з мэтай наступнай арганізацыі рацыянальнай сельскай гаспадаркі".

Увядзенне аўтарам у навуковы зварот вялікай колькасці архіўных дакументаў і першакрыніц дазваляе больш поўна асвятліць асобныя маладаследаваныя аспекты правядзення камасацыі ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. і даць аб'ектыўную і ўзважаную ацэнку разглядаемым падзеям.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

### Сувязь працы з навуковымі праграмамі і тэмамі

Дысертацыя падрыхтавана ў рамках Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў № 16 "Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава", навуковай тэмы "Трансфармацыя эканамічнага, сацыяльна-палітычнага і культурнага развіцця Беларусі XIX–XX стст: гістарыяграфія, крыніцы", выконваемай па кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта БДУ ў 2011–2015 гг.

### Мэта і задачы даследавання

*Мэта* дысертацыйнага даследавання – на падставе аналізу дакументальных крыніц і навуковай літаратуры вызначыць змест і асноўныя напрамкі правядзення польскімі ўладамі камасацыі ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., паказаць яе галоўныя вынікі і значэнне.

Для дасягнення азначанай мэты былі пастаўлены наступныя задачы:

– прааналізаваць становішча сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі на пачатку 1920–х гг. і ацаніць неабходнасць ажыццяўлення камасацыі;

– ахарактарызаваць пазіцыі асноўных палітычных партый па пытанні камасацыі;

[3] Tarasiewicz, O. Scalanie w powiecie braslawskim / O. Tarasiewicz. – Poznań : Uniw. Poznański, 1937. – 120 s. [S. 48]; Zieliński, A. Scalanie gruntów w prawie polskim / A. Zieliński. – Poznań : Uniw. im. A. Mickiewicza, 1972. – 125 s. [S. 29, 32–33].

– прааналізаваць заканадаўчую базу правядзення камасацыі як складовай часткі аграрнай рэформы ў міжваеннай Польшчы;

– вызначыць месца камасацыі ў кантэксце аграрнай рэформы ў дакрызісны перыяд (1921–1928 гг.);

– ацаніць уплыў сусветнага эканамічнага крызісу 1929–1933 гг. на правядзенне камасацыі;

– вызначыць уздзеянне камасацыі на развіццё вёскі ў паслякрызісны перыяд (1934–1939 гг.).

**Аб'ект даследавання** – ажыццяўленне камасацыі ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. як складовай часткі аграрнай рэформы ў міжваеннай Польшчы. **Прадмет даследавання** – перадумовы, метады, спецыфіка правядзення камасацыі і яе сацыяльна-эканамічныя наступствы.

## Навуковая навізна

На аснове сістэматызацыі крыніц і навуковых прац ажыццёўлены аналіз перадумоў і заканадаўчага забеспячэння камасацыі ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. у кантэксце канкрэтна-гістарычнай сітуацыі пры выкарыстанні сучасных падыходаў гістарычнай навукі. У дысертацыі ўсебакова паказана рэалізацыя камасацыі як складовай часткі мадэрнізацыі аграрнай сферы і пераходу мясцовай сельскай гаспадаркі на інтэнсіўны шлях развіцця, раскрыты асноўныя асаблівасці кожнага з вызначаных этапаў правядзення камасацыі.

Аўтар дысертацыі пашырыў і ўдакладніў уяўленні аб месцы сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі ў народна-гаспадарчым комплексе міжваеннай Польшчы, разгледзеў становішча заходнебеларускага сялянства ў гэты перыяд і абгрунтаваў неабходнасць камасацыі. У дысертацыі прааналізаваны падыходы асноўных палітычных партый да ажыццяўлення аграрных пераўтварэнняў і ў тым ліку адносна рэалізацыі камасацыі. Аўтарам адзначаны галоўныя перашкоды на шляху аб'яднання сялянскіх надзелаў і паказана эвалюцыя заканадаўчай базы камасацыі, вызначаны яе асноўныя напрамкі і спецыфіка адносна Заходняй Беларусі. На падставе афіцыйных статыстычных крыніц падлічана плошча аб'яднаных зямельных надзелаў і колькасць скамасаваных заходнебеларускіх гаспадарак за 1921–1939 гг., акрамя таго, выяўлены аспекты, якія патрабуюць далейшага вывучэння (рэалізацыя ў Заходняй Беларусі парцэляцыі, правядзенне меліярацыі, ліквідацыі сервітутаў і г. д.).

У дысертацыйным даследаванні раскрыты сутнасць і метады рэалізацыі камасацыі на кожным з вызначаных этапаў:

– на першым этапе (1921–1928 гг.) ішла распрацоўка асноў палітыкі міжваеннай польскай дзяржавы (у тым ліку і аграрнай) і спроба ліквідацыі вялікай колькасці перашкод на гэтым шляху (перш за ўсё неаднароднасць сацыяльна-эканамічнага развіцця розных рэгіёнаў міжваеннай Польшчы, недахоп кваліфікаваных кадраў, у тым ліку землямераў, і г. д.);

– на другім этапе (1929–1933 гг.) вялікі негатыўны ўплыў на правядзенне камасацыі аказаў сусветны эканамічны крызіс, які падарваў і без таго цяжкае матэрыяльнае становішча заходнебеларускіх сялян і выклікаў неабходнасць сутнаснай дзяржаўнай дапамогі, якая ў сілу рознага роду прычын была вельмі недастатковай і абмежаванай. У такіх складаных фінансавых умовах польскія ўлады бачылі ў камасацыі адзін са сродкаў мінімізацыі наступстваў крызісу і ў першую чаргу ішлі на адтэрміноўку плацяжоў па крэдытах, арганізоўвалі для вяскоўцаў з мэтай павышэння іх агульнадукацыйнага і асабліва агратэхнічнага ўзроўню рознага роду асветніцкія курсы, выставы і г. д.;

– на трэцім этапе (1934–1939 гг.) эканамічны стан сялянства Заходняй Беларусі дзякуючы павышэнню коштаў на сельскагаспадарчыя тавары часткова палепшыўся, што істотна паспрыяла камасацыі. На падставе назапашанага дзяржаўнымі ўладамі вопыту палітыка камасацыі стала праводзіцца больш планамерна і цэнтралізавана, але ў сілу ўздзеяння розных фактараў камасацыя так і не была даведзена да канца.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Абсалютную большасць заходнебеларускага насельніцтва (больш 80 %) у 1921–1939 гг. складала сялянства, якое знаходзілася ў цяжкім матэрыяльным становішчы і патрабавала адчувальнай падтрымкі з боку дзяржавы. Адной з галоўных праблем у аграрнай сферы Заходняй Беларусі стала цераспалосіца (больш 60 % сялян мелі па некалькі невялікіх раскіданых надзелаў зямлі), якая з’яўлялася істотнай перашкодай на шляху далейшага развіцця сельскай гаспадаркі. Такая сітуацыя абмяжоўвала гаспадарчую ініцыятыву заходнебеларускіх сялян і абцяжарвала іх становішча, перашкаджала пераходу эканомікі рэгіёну на якасна новы ўзровень. У гэты перыяд камасацыя ў вачах прадстаўнікоў значнай часткі польскай эліты і большасці тагачаснага грамадства разглядалася як эфектыўны сродак ліквідацыі цераспалосіцы і гаспадарчага аднаўлення Заходняй Беларусі, складвання адзінага ўнутранага рынку і пераводу сельскай гаспадаркі рэгіёну на капіталістычныя адносіны, таму ёй надавалася асаблівае значэнне і роля, у першую чаргу як аснова для правядзення наступных аграрных пераўтварэнняў.

2. Аграрнае пытанне займала асаблівае месца ў праграмах палітычных партый Польскай Рэспублікі ў міжваенны перыяд. Існуючыя тады палітычныя сілы ў адносінах да камасацыі мэтазгодна падзяліць наступным чынам: 1) агульнапольскія легальныя; 2) заходнебеларускія нацыянальна-дэмакратычныя партыі; 3) Камуністычная партыя Польшчы (КПП) і Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ) як яе складовая частка. Погляды прадстаўнікоў агульнапольскіх легальных партый значна адрозніваліся па асноўных пытаннях палітычнага развіцця дзяржавы, але адносна правядзення аграрных

пераўтварэнняў яны ў многім супадалі. Камасацыя падтрымлівалася імі і разглядалася як сродак рацыяналізацыі сельскай гаспадаркі і спосаб стварэння шматлікай праслойкі заможнага сялянства, эканамічна моцнай і лаяльнай да польскага панавання. Заходнебеларускія палітычныя арганізацыі пераважна падтрымлівалі камасацыю пры ўмове аказання сялянам збоку дзяржавы як мага большай дапамогі. Выразна адрознівалася пазіцыя КПП і КПЗБ, якія выступалі за вырашэнне аграрнага пытання рэвалюцыйным шляхам і перадачу ўсёй зямлі без выкупу сялянству.

3. Рэалізацыя сістэмных аграрных пераўтварэнняў патрабавала добра распрацаванага заканадаўства. Большасць паслоў Сейма належала да буйных землеўласнікаў, таму пытанне заканадаўчага афармлення аграрнай рэформы (у тым ліку камасацыі) стала прадметам працяглых дыскусій і мела мэтай захаванне памешчыцкага дамінавання на вёсцы толькі пры некаторым яго абмежаванні. У сувязі з гэтым першапачаткова ў Заходняй Беларусі дзейнічалі нормы заканадаўства былой Расійскай Імперыі, перш за ўсё аграрныя законы, прынятыя па ініцыятыве П. А. Сталыпіна. Згодна закона аб камасацыі ад 31 ліпеня 1923 г. раскіданыя сялянскія надзелы падлягалі аб'яднанню з улікам іх грашовай вартасці. Камасацыя магла праводзіцца і прымусова, калі гэта было ў інтарэсах дзяржавы. Польскія кіруючыя колы прыкладалі істотныя намаганні для юрыдычнага афармлення абароны скамасаваных гаспадарак ад далейшага драблення, але не змаглі прыняць адпаведнага закона. Прынятыя па пытанні камасацыі законы прадугледжвалі падтрымку заможнага сялянства як сацыяльнай апоры польскага ўрада на вёсцы і гаранта харчовай бяспекі краіны, таму адпавядалі ў першую чаргу яго інтарэсам. Поспех камасацыі быў немагчымым без дадатковага надзялення сялян ворнай зямлёй, што ажыццяўлялася ў ходзе парцэляцыі на аснове законаў ад 15 ліпеня 1920 г. і ад 28 снежня 1925 г. Свабодныя абшары зямлі ўлады перадавалі пераважна асаднікам і сялянам-каталікам, а іншыя катэгорыі вяскоўцаў атрымлівалі яе відавочна недастаткова.

4. Падрыхтоўка да правядзення ў Заходняй Беларусі камасацыі пачалася ў 1921 г., адразу пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора. На першым этапе (1921–1928 гг.) ішла распрацоўка яе палітыкі, у тым ліку і аграрнай, а таксама адбудова разбуранай войнамі эканомікі рэгіёна. Пры непасрэднай рэалізацыі камасацыі польскі ўрад сутыкнуўся з шэрагам істотных праблем: недахоп кваліфікаваных інжынераў-землямераў, неспрыяльныя прыродныя ўмовы, нерацыянальная канфігурацыя транспартнай сеткі, цяжкае матэрыяльнае становішча большай часткі заходнебеларускага сялянства і інш. Ажыццяўленне камасацыі асобнай вёскі патрабавала дакладнага высвятлення маёмасных адносін у зямельным пытанні, афармлення вялікай колькасці

нарматыўна-тэхнічнай дакументацыі і г. д., што значна зацягвала аб'яднанне сялянскіх надзелаў і выклікала рэзкае незадавальненне вяскоўцаў.

5. Вялікі негатыўны ўплыў на правядзенне камасацыі аказаў сусветны эканамічны крызіс 1929–1933 гг., які ахапіў усе сферы эканомікі і асабліва праявіўся ў галіне сельскай гаспадаркі. Польская Рэспубліка ў міжваенны перыяд была пераважна аграрнай краінай, таму сусветны эканамічны крызіс выклікаў тут асабліва вялікія адмоўныя наступствы, у тым ліку і ў рэалізацыі камасацыі. У разглядаемы перыяд кошты на сельскагаспадарчыя тавары, асабліва на прадукты, рэзка знізіліся, што пагоршыла матэрыяльнае становішча сялян і адпаведна прывяло да немагчымасці своечасовай аплаты імі камасацыйных работ. Разам з тым польскі ўрад бачыў у камасацыі сродак барацьбы з наступствамі крызісу, таму прыкладаў вялікія намаганні для заахвочвання сялянства да яе ажыццяўлення, і ў выніку тэмпы камасацыі паскорыліся, але фактычна за кошт самаадданай працы сялян. Скамасаваныя раней гаспадаркі апынуліся больш устойлівымі ва ўмовах крызісу дзякуючы канцэнтрацыі зямельных надзелаў і выкарыстанню перадавых метадаў апрацоўкі зямлі.

6. Больш паспяховымі для камасацыі сталі 1934–1939 гг., калі кошты на прадукты сельскагаспадарчай вытворчасці выраслі, што ў некаторай ступені выправіла матэрыяльнае становішча сялянства. Банкаўскія крэдыты на аплату прац па камасацыі былі сродкам істотнага паляпшэння становішча ў сферы мясцовай сельскай гаспадаркі, але не ўсе сяляне маглі своечасова іх выплачваць. Усяго за 1921–1939 гг. у Заходняй Беларусі было скамасавана 259 305 гаспадарак (35,5 % ад запланаванага), якія ахоплівалі каля 1 928 850 га зямлі (каля 30 %). У выніку камасацыя аказала значны пазітыўны ўплыў на станаўленне ў аграрнай сферы Заходняй Беларусі таварна-рынкавых адносін і далейшае развіццё мясцовай сельскай гаспадаркі дзякуючы паляпшэнню паказчыкаў ураджайнасці зямлі. Камасацыя ўскосным чынам спрыяла павышэнню агульнаадукацыйнага ўзроўню і агратэхнічнай падрыхтоўкі мясцовага сялянства, аказала вялікае ўздзеянне на развіццё вёскі і дабрабыт яе жыхароў. Найбольш складанымі ўмовы для ажыццяўлення камасацыі ў 1921–1939 гг. былі ў Палескім ваяводстве, якое характарызавалася высокай ступенню забалочанасці, адноснай беднасцю насельніцтва, слаба развітай дарожнай сеткай, а таксама памежным становішчам.

## Асабісты ўклад саіскальніка

Дысертацыя з'яўляецца вынікам самастойнай даследчыцкай работы аўтара і навуковага аналізу першакрыніц і прац прадстаўнікоў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, у якіх закранаюцца пытанні, сумежныя з тэмай дысертацыі.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

## Артыкулы ў навуковых выданнях згодна з п. 18 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь

1. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі ў Палескім ваяводстве II Рэчы Паспалітай (1921–1939 гг.) / В. П. Гарматны // Беларускі гістарычны зборнік = Białoruskie Zeszyty Historyczne / Беларус. гіст. т-ва. – Беласток, 2008. – № 30. – S. 162–171.

2. Гарматны, В. П. Савецкая гістарыяграфія 1920–1940–хх гг. правядзення камасацыі на землях Заходняй Беларусі / В. П. Гарматны // Весн. Гродзен. ун-та. Сер. 1, Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. – 2011. – № 2. – С. 52–56.

3. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі ў вёсцы Хацілкі Свірскай гміны Свянцянскага павета Віленскага ваяводства (1926–1930 гг.) / В. П. Гарматны // Беларускі гістарычны зборнік = Białoruskie Zeszyty Historyczne / Беларус. гіст. т-ва. – Беласток, 2011. – № 35. – S. 118–126.

4. Гарматный, В. П. Ликвидация чересполосицы на землях Западной Беларуси в 1921–1928 гг. / В. П. Гарматный // Вопр. истории. – 2011. – № 7. – С. 135–139.

5. Гарматны, В. П. Выступленне сялян вёскі Баранава Гродзенскага павета Беластоцкага ваяводства супраць правядзення камасацыі (1930–1932 гг.) / В. П. Гарматны // Науч. тр. Респ. ин-т высш. шк. Серия Исторические и психолого-педагогические науки – Минск, 2011. – Вып. 11, ч. 1. – С. 38–45.

6. Гарматны, В. П. Заканадаўчая база правядзення камасацыі на землях Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гг. / В. П. Гарматны // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2012. – № 2. – С. 37–43.

7. Гарматны, В. П. Сучасная айчынная гістарыяграфія правядзення камасацыі на землях Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Гістарычна-археалагічны зборнік / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2012. – Вып. 27 / рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – С. 118–121.

8. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі ў Навагрудскім ваяводстве (1921–1939 гг.) / В. П. Гарматны // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2012. – Вып. 7. – С. 35–43.

9. Гарматны, В. П. Савецкая пасляваенная гістарыяграфія правядзення камасацыі на землях Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Весці Нацыянальнай Акадэміі Навук. Серыя грамадскіх навук. – 2013. – № 1. – С. 51–56.

10. Гарматны, В. П. Дзяржаўны Сельскагаспадарчы Банк ІІ Рэчы Паспалітай і яго роля ў ажыццяўленні ў Заходняй Беларусі камасацыі (1919–1939 гг.) / В. П. Гарматны // Biuletyn Historii Pogranicza (Бюлетэнь Гісторыі Памежжа). – Беласток, 2013. – № 13. – S. 67–83.

11. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі на тэрыторыі Пінскага павета Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Веснік Палес. дзярж. ун-та. Серыя грамадскіх і гуманітарных навук. – 2013. – № 2. – С. 22–28.

12. Гарматны, В. П. Пытанне камасацыі ў праграмах палітычных партый ІІ Рэчы Паспалітай (1919–1939 гг.) / В. П. Гарматны // Российские и славянские исследования : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т ; ред. совет: В. А. Федосик (пред.) [и др.]. – Минск, 2013. – Вып. 7. – С. 131–136.

13. Гарматны, В. П. Асноўныя цяжкасці на шляху ажыццяўлення камасацыі ў Палескім ваяводстве ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Biuletyn Historii Pogranicza (Бюлетэнь Гісторыі Памежжа). – Беласток, 2014. – № 14. – S. 45–56.

14. Гарматны, В. П. Мадэрнізацыя сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Гісторыя і грамадазнаўства. – 2015. – № 2. – С. 50–53.

15. Гарматный, В. П. В. Станевич и земельная реформа в Западной Беларуси в 1921–1939 гг. / В. П. Гарматный // Вопр. истории. – 2015. – № 6. – С. 114–123.

16. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі на тэрыторыі Віленскага ваяводства ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Беларускі гістарычны зборнік = Białoruskie Zeszyty Historyczne / Беларус. гіст. т-ва. – Беласток, 2015. – № 43. – S. 135–157.

**Артыкулы ў іншых навуковых часопісах і зборніках навуковых прац**

17. Гарматны, В. П. Сістэмная трансфармацыя сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Системная трансформация общества: инновации и традиции : сб. науч. тр. / Брест. гос. техн. ун-т ; под общ. ред. С. В. Лапиной. – Брест, 2010. – Вып. 7. – С. 45–49.

18. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі на тэрыторыі Косаўскага павета Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Системная трансформация общества: исторический опыт, современность, перспективы : сб. науч. тр. / Брест. гос. техн. ун-т ; под общ. ред. Л. Г. Титаренко. – Брест, 2011. – Вып. 8. – С. 46–50.

19. Гарматны, В. П. Матэрыялы фонду Палескай акруговай зямельнай управы па правядзенні камасацыі на тэрыторыі Палескага ваяводства ў 1921–1933 гг. (па дакументах ДАБВ) / В. П. Гарматны // Архіварыус : зб. навук.-

папул. паведамленняў і арт. Сер.: Гісторыя, архівазнаўства, крыніцазнаўства. – Мінск, 2011. – Вып. 9. – С. 109–115.

20. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі на землях Заходняй Беларусі ў гады эканамічнага крызісу (1929–1933 гг.) / В. П. Гарматны // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2012. – № 3. – С. 100–104.

21. Гарматны, В. П. Перыядызацыя правядзення камасацыі на землях Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Вестн. Брест. гос. техн. ун-та. – 2012. – № 6. – С. 27–30.

22. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі на тэрыторыі Драгічынскага павета Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Системная трансформация общества: исторический опыт, современность, перспективы : сб. науч. тр. / Брест. гос. техн. ун-т ; под общ. ред. Я. С. Яскевич. – Брест, 2013. – Вып. 10. – С. 36–40.

23. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі ў вёсцы Блудзень гміны Бяроза-Картузская Пружанскага павета Палескага ваяводства ў 1924–1926 гг. / В. П. Гарматны // Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі : Бяроза і Бярозаўскі раён : зб. навук. арт. / Нац. Акад. Навук Беларусі; Ін-т Гісторыі ; редкол.: А. П. Солодков (гл. ред.) [и др.]. – Мінск, 2014. – С. 306–319.

24. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі на тэрыторыі Брэсцкага павета Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Регионалистика : сб. науч. тр. / Гродн. гос. ун-т; редкол. В. Н. Ватыль (гл. ред.) [и др.]. – Гродно, 2015. – Вып. 3. – С. 58–62.

## Артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый

25. Гарматны, В. П. Сельская гаспадарка Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Народы, культуры и социальные процессы на пограничье : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Гродно, 22–23 февр. 2010 г. / Гродн. гос. ун-т [и др.] ; [редкол: Е. М. Бабосов (отв. ред.) и др.]. – Гродно, 2010. – С. 133–136.

26. Гарматны, В. П. Становішча сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі пасля савецка–польскай (1919–1921 гг.) вайны / В. П. Гарматны // Европа: актуальные проблемы этнокультуры : материалы III Междунар. науч.-теорет. конф., Минск, 25 апр. 2010 г. / Белорус. гос. пед. ун-т ; редкол.: В. В. Тугай (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2010. – С. 359–362.

27. Гарматны, В. П. Уладзіслаў Грабскі і закон аб аграрнай рэформе ад 28 снежня 1925 г. / В. П. Гарматны // Личность в истории: героическое и трагическое : сб. материалов Четвертой междунар. науч.-практ. конф. аспирантов и молодых ученых, Брест, 26–27 нояб. 2010 г. / Брест. гос. ун-т ; редкол.: М. Э. Чесновский (гл. ред.) [и др.]. – Брест, 2011. – С. 44–50.

28. Гарматны, В. П. Апублікаваныя крыніцы па гісторыі правядзення камасацыі на землях Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Актуальныя праблемы крыніцазнаўства айчыннай гісторыі : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Віцебск, 6–7 кастр. 2011 г. / Віцеб. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. М. Дулаў (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск, 2011. – С. 149–152.

29. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі на тэрыторыі Кобрынскага павета Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Романовские чтения – 8 : сб. ст. междунар. науч. конф., Могилев, 24 нояб. 2011 г. / Могилев. гос. ун-т ; редкол.: Я. Г. Риер (пред.) [и др.]. – Могилев, 2012. – С. 207–209.

30. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі ў II Рэчы Паспалітай (1921–1939 гг.) / В. П. Гарматны // Актуальные проблемы и перспективы изучения новой и новейшей истории зарубежных стран : материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 75–летию образования кафедры ист. нового и новейшего времени, Минск, 25 октября 2012 г. / Бел. гос. ун-т ; редкол.: В. С. Кошелев (пред.) [и др.]. – Минск, 2012. – С. 41–44.

31. Гарматны, В. П. Публікацыі міжваеннага перыяда аб тэхнічным ажыццяўленні камасацыі ў Заходняй Беларусі / В. П. Гарматны // Актуальные проблемы источниковедения : материалы междунар. научн.-практ. конф., Витебск, 10–11 октябр. 2013 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: А. Н. Дулов (отв. ред.) [и др.]. – Витебск, 2013. – С. 91–94.

32. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі на тэрыторыі Столінскага павета Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Україна та Польща, крізь призму століть. Матеріали Міжнар. наук.-практ. конф. "Поляки на Чернігово-Сіверщині – "свої"-"чужі", м. Ніжин, 21 лютого 2014 р. / Ніжинський держ. ун-т ім. М. Гоголя. – Ніжин, 2014. – С. 221–228.

33. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі на тэрыторыі Лунінецкага павета Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Трансформационные процессы в бел. обществе в Новейшее время: материалы Респ. науч.-практ. конф., Барановичи, 18 апреля 2014 г. / Баранов. гос. ун-т ; редкол. : А. В. Никишова (гл. ред.) [и др.]. – Барановичи, 2014. – С. 42–45.

## Тэзісы

34. Гарматны, В. П. Стварэнне і дзейнасць Палескай акруговай зямельнай управы (1921–1933 гг.) / В. П. Гарматны // IV Машеровские чтения : материалы междунар. науч.-практ. конф. студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 28–29 окт. 2010 г. : в 2 т. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: А. П. Солодков (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2010. – Т. 1. – С. 213–214.

35. Гарматны, В. П. Выступленне сялян в. Падлессе Брэст–Бужскага павета Палескага ваяводства супраць правядзення камасацыі (1936–1938 гг.) /

В. П. Гарматны // Актуальные проблемы современного гуманитарного образования : материалы VII Респ. науч. конф. молодых ученых и аспирантов, Минск, 25 нояб. 2010 г. / Респ. ин-т высш. шк. ; редкол.: И. В. Титович [и др.]. – Минск, 2010. – С. 42–44.

36. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі на тэрыторыі гміны Міжлессе Пружанскага павета Палескага ваяводства (1925–1930 гг.) / В. П. Гарматны // Актуальные проблемы в изучении и преподавании общественно-гуманитарных наук (дисциплин) : материалы I Междунар. науч. конф., Витебск, 2–3 дек. 2010 г. / Междунар. ин-т трудовых и соц. отношений, Витеб. фил. ; редкол.: В. А. Космач (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2010. – С. 54–55.

37. Гарматны, В. П. Закон ад 10 ліпеня 1919 г. як першы этап заканадаўчага афармлення аграрнай рэформы на землях Заходняй Беларусі / В. П. Гарматны // Праблемы гісторыі дзяржавы і права Беларусі : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 18–19 сак. 2011 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С. А. Балашэнка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – С. 119–122.

38. Гарматны, В. П. Да пытання аб правядзенні камасацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Материалы XIV научной сессии преподавателей и студентов : Витебск, 22 апр. 2011 г. : [сб. докл.] / Междунар. ин-т трудовых и соц. отношений, Витеб. фил. ; [редкол.: В. А. Космач (отв. ред.) и др.]. – Витебск, 2011. – С. 66–67.

39. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі на тэрыторыі Пружанскага павета Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // XIII Респ. науч.-метод. конф. молодых ученых : сб. материалов, Брест, 13 мая 2011 г. : в 2 ч. / Брест. гос. ун-т ; под общ. ред. В. В. Здановича. – Брест, 2011. – Ч. 2. – С. 12–14.

40. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі ў вёсцы Палужжа Карэліцкай гміны Навагрудскага павета Навагрудскага ваяводства ў 1924–1926 гг. / В. П. Гарматны // V Машеровские чтения : материалы междунар. науч.-практ. конф. студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 29–30 сент. 2011 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: А. П. Солодков (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2011. – С. 83–85.

41. Гарматны, В. П. Польская гістарыяграфія правядзення камасацыі на землях Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // XIV Респ. науч.-метод. конф. молодых учёных : сб. материалов, Брест, 11 мая 2012 г. : в 2 ч. / Брест. гос. ун-т ; под общ. ред. В. В. Здановича. – Брест, 2012. – Ч. 2. – С. 48–50.

# РЭЗЮМЭ


## Гарматны Віталь Пятровіч
## Правядзенне камасацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)

***Ключавыя словы:*** камасацыя, цераспалосіца, хутар, аграрная палітыка, зямельная рэформа, ураджайнасць, меліярацыя, сервітут, парцэляцыя, вёска, зямельная ўправа, землямер.

***Мэта работы:*** на падставе аналізу дакументальных крыніц і навуковай літаратуры вызначыць змест і асноўныя напрамкі правядзення польскімі ўладамі камасацыі ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., паказаць яе галоўныя вынікі і значэнне.

***Метады даследавання:*** Метадалогія даследавання абумоўлена яго прадметам, метадамі і задачамі. Тэарэтычна-метадалагічную базу даследавання склалі прынцыпы гістарызму і аб'ектыўнасці.

У даследаванні выкарыстаны комплекс асноўных агульнанавуковых метадаў і метадаў гістарычнага даследавання. Да першай групы адносяцца – аналіз, сінтэз, тыпалагізацыя, класіфікацыя, да другой – гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны і колькасны метады.

***Атрыманыя вынікі і іх навуковая навізна*** заключаюцца ў ажыццяўленні на аснове сістэматызацыі крыніц і навуковых прац аналізу перадумоў і заканадаўчага забеспячэння камасацыі ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. у кантэксце канкрэтна-гістарычнай сітуацыі пры выкарыстанні сучасных падыходаў гістарычнай навукі. У дысертацыі ўсебакова паказана рэалізацыя камасацыі як складовай часткі мадэрнізацыі аграрнай сферы і пераходу мясцовай сельскай гаспадаркі на інтэнсіўны шлях развіцця, раскрыты асноўныя асаблівасці кожнага з вызначаных этапаў правядзення камасацыі.

***Рэкамендацыі па выкарыстанню, сфера прымянення:*** матэрыялы дысертацыі выкарыстаны пры распрацоўцы вучэбнай праграмы дысцыпліны "Гісторыя сельскай гаспадаркі Беларусі", якая выкладаецца на інжынерным факультэце Баранавіцкага дзяржаўнага універсітэта В.П. Гарматным, аб чым сведчыць Акт аб укараненні.

Аналітычны і фактычны матэрыял дысертацыі можа быць выкарыстаны пры напісанні артыкулаў, падручнікаў, навучальных дапаможнікаў, абагульняючых прац па гісторыі Беларусі.

# РЕЗЮМЕ

**Гарматный Виталий Петрович**
**Проведение комасации на территории Западной Беларуси (1921–1939 гг.)**

***Ключевые слова:*** комасация, чересполосица, хутор, аграрная политика, земельная реформа, урожайность, мелиорация, сервитут, парцелляция, деревня, земельное управление, землемер.

***Цель работы:*** на основе анализа документальных источников и научной литературы раскрыть сущность и основные направления проведения польскими властями комасации в Западной Беларуси в 1921–1939 гг., показать ее главные результаты и значение.

***Методы исследования:*** методология исследования обусловлена его предметом, методами и задачами. Теоретико-методологическую базу исследования составили принципы историзма и объективности.

В исследовании использован комплекс основных общенаучных методов и методов исторического познания. К первой группе относятся анализ, синтез, типология, классификация, к второй – историко-генетический, историко-типологический, историко-сравнительный, историко-системный и количественный методы.

***Полученные результаты и их научная новизна*** заключаются в осуществлении на основе систематизации источников и научных трудов анализа предпосылок и законодательного обеспечения комасации в Западной Беларуси в 1921–1939 гг. в контексте конкретно-исторической ситуации при использовании современных подходов исторической науки. В диссертации всесторонне показана реализация комасации как составной части модернизации аграрной сферы и перехода местного сельского хозяйства на интенсивный путь развития, раскрыты основные особенности каждого из определенных этапов проведения комасации.

***Рекомендации по использованию, область применения:*** материалы диссертации использованы при разработке учебной программы дисциплины "История сельского хозяйства Беларуси", которая преподается на инженерном факультете Барановичского государственного университета В.П. Гарматным, о чем свидетельствует Акт о внедрении.

Аналитический и фактический материал диссертации может быть использован при написании статей, учебников, учебных пособий, обобщающих работ по истории Беларуси.

## SUMMARY


### Harmatny Vital Piatrovich
### Comasation realization on the territory of Western Belarus (1921–1939)

***Key words:*** comasation, strip farming, farmstead, agrarian policy, land reform, productivity, melioration, servitut, parcelation, village, land management, land survey.

***Aim of the research:*** to provide a scientific analysis, based on the documental resources and scientific literature, of the conducting of comasation and its main ways on the territory of Western Belarus in 1921–1939; show it's specify results and value.

***Methods of the research:*** the research methodology is formed by such main principles of scientific cognition of historical processes as objectivity and historism. This research has been pursued in accordance with the general scientific methods and methods of historical cognition. The former includes analysis, synthesis, typologisation and classification; and the latter – historical-genetic, historical-typological, historical-comparative, historical-systematic and numeral methods.

***Scientific novelty of the results*** is to implement on the basis of systematization of sources and scientific works of the background and legislative support comasation in Western Belarus in 1921–1939. in the context of concrete historical situation by using modern approaches of historical science. In the thesis comprehensively shown comasation implementation as part of the modernization of the agricultural sector and the transition of local agriculture to intensive development, disclosed the main features of each of the specific phases of comasation.

***Recommendations for the use, application area:*** the dissertation materials used in the development of the curriculum of discipline "History of Agriculture of Belarus", which is taught in the Faculty of Engineering Baranovichi State University by V.P. Harmatny, as evidenced by the Act of introduction.

The analytical and practical material of the research can be used for writing papers on the history of Belarus.

Подписано в печать 08.09.2016. Формат 60×84 $^{1}/_{16}$. Бумага офсетная.
Ризография. Усл. печ. л. 1,63. Уч.-изд. л. 1,75.
Тираж 65 экз. Заказ 513.

Отпечатано с оригинала-макета заказчика
в республиканском унитарном предприятии
«Издательский центр Белорусского государственного университета».
Свидетельство о государственной регистрации издателя, изготовителя,
распространителя печатных изданий № 2/63 от 19.03.2014.
Ул. Красноармейская, 6, 220030, Минск.